# 75 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Пузыні



**Уладзімір ПУЗЫНЯ** нарадзіўся 26 лютага 1940 г. у вёсцы Суцін (Пухавіцкі раён). Яго бацька, Якуб Пузыня, загінуў на фронце ў 1941-м. Маці з малымі дзецьмі ратавалася ў бежанстве ва Украіне, з цяжкасцю ўдалося ім вярнуцца дадому. Пасля школы Уладзімір працаваў качагарам, потым лякальшчыкам на заводзе. Скончыў музычную вучэльню па класу трубы, магілёўскую школу мастацтваў (дзе вывучыў майстэрства іканапісу). Выкладаў у музычнай школе, саліраваў у народным аркестры Жыновіча.

У 1970-я разам з майстрам Уладзімірам Крайко пачаў рабіць народныя інструменты. Ад 1982 Пузыня працаваў у Інстытуце культуры выкладчыкам па авалоданні ігрою на беларускіх народных інструментах. Адкрыў лабараторыю па адраджэнні і вырабе беларускіх народных інструментаў "Беларуская Хатка". У ей наладзіў рамонт і выраб унікальных лiраў, дудаў, адрадзіў старажытныя, ужо забытыя, сурму і жалейку, хорум, апісанне якога было толькі ў летапісах і на малюнках. У 1990 годзе Пузыня напісаў і выдаў кнігу "Школа ігры на беларускіх народных інструментах", у вялікай меры дзякуючы якой упершыню ў гісторыі музычнага мастацтва беларускія народныя інструменты ўвайшлі ў партытуру опернага сімфанічнага аркестра.

Свой досвед народны майстра перадаў сыну Алесю, які скончыў Універсітэт культуры. У пачатку 1990 гадоў ні адзін значны канцэрт ці якая іншая ўрачыстасць не праходзілі без удзелу музыкаў Уладзіміра і Алеся Пузыняў. Яны заўжды былі ў гушчы культурных і палітычных падзеяў Беларусі.

У 1994 годзе бацька і сын, каб рэпрэзентаваць Беларусь на фестывалі лірнікаў у Францыі, выправіліся туды за свой кошт. Праз год музыкаў запрасілі з канцэртам у ЗША ў штат Тэхас. А вярнуліся дахаты яны ўжо пасля рэферэндуму. Усё крута памянялася, пачынаючы з адносінаў кіраўніцтва Універсітэта культуры, дзе месціцца "Беларуская Хатка". Пузыню далі працу толькі на палову стаўкі, а потым выправілі на пенсію. Апошнія гады ён жыў у вёсцы Ганалес (Менскі раён).

Памёр 18 верасня 2012 года.

***Вікіпедыя.***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ